# 24 сонечныя перыяды: Восень

Тэкст Гао Чуньсян, Шао Мінь

Ілюстрацыі Сю Мінчжэнь, Лі Цзын



CIPG

中国国际出版集团

海豚出版社





## Песня сонечных перыядаў

Вясной[1] дождж[2] абуджаецца[3], вясенні[4] чысты[5] дождж[6].
Летам[7] збожжа[8] каласіцца[9], наліваецца ў летнюю[10] спёку[11].
Восенню[12] спёка[13] сціхае, час восеньскіх[15] росаў[16] ды шэрані[17].
Зімой[18] снежнай[19], вельмі снежнай[20], час зімовых[21] халадоў[22].

---

1 Пачатак вясны 2 Дажджавая вада 3 Абуджэнне насякомых 4 Вясенняе раўнадзенства
5 Чыстае святло 6 Хлебны дождж 7 Пачатак лета 8 Наліўное збожжа 9 Каласаванне хлябоў
10 Летняе сонцастаянне 11 Малая спёка і Вялікая спёка 12 Пачатак восені 13 Спад спёкі
14 Белыя росы 15 Восеньскае раўнадзенства 16 Халодныя росы 17 З'яўленне шэрані
18 Пачатак зімы 19 Малы снег 20 Вялікі снег 21 Зімовае сонцастаянне 22 Малы холад і Вялікі холад

Lovely China

First original geographical picture books in China

# 24 СОНЕЧНЫЯ ПЕРЫЯДЫ: ВОСЕНЬ

Тэкст Гао Чуньсян, Шао Мінь

Ілюстрацыі Сю Мінчжэнь, Лі Цзын



Мінск
«Новое знание»
2021

海豚出版社
DOLPHIN BOOKS
CIPG 中国国际出版集团

УДК 087.5:502
ББК 20.1
Г19



Існуе чатыры пары года. Старажытныя кітайцы падзялілі іх на 24 сонечныя перыяды, кожны з якіх адлюстроўвае адметную фазу сезонных зменаў. Сонечныя перыяды не толькі падказваюць, што трэба рабіць земляробам, але і дапамагаюць кожнаму з нас прадбачыць змены надвор'я.

Гэта кніга апавядае гісторыю дзяўчынкі Яі, якая наведвае сваіх бабулю і дзядулю ў вёсцы і назірае, як 24 сонечныя перыяды паступова змяняюць адзін аднаго на працягу года. Разам з Яяй вы трапіце на традыцыйныя кітайскія святы, даведаецеся пра старажытныя абрады, навучыцеся лепш разумець мову прыроды, назіраючы за жывёламі, раслінамі і з'явамі надвор'я.

Выданне для вольнага часу

**Гао Чуньсян, Шао Мінь**

**24 СОНЕЧНЫЯ ПЕРЫЯДЫ: ВОСЕНЬ**

Для чытання дарослымі дзецям
Пераклад з англійскай мовы Таццяны Цуканавай
Адказны за выданне Вікторыя Маўчанская

Падпісана да друку 24.02.2021. Фармат 60×90 $^{1}/_{8}$. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,0. Ул.-выд. арк. 6,5. Тыраж 200 экз. Заказ 337.

ТАА «Новое знание». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/276 ад 23.12.2015. Пр. Пушкіна, д. 15а, Мінск, Рэспубліка Беларусь. Паштовы адрас: а/с 79, 220050, Мінск, Рэспубліка Беларусь. Тэлефон/факс: (10-375-17) 360-20-02; e-mail: nk@wnk.biz; http://wnk.biz

«ГРАДИЕНТ»®. Таварыства з абмежаванай адказнасцю «НАВИТЕХ». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/194 ад 23.02.2017. Вул. Бабушкіна, 6А, 220024, Мінск.

**Original title: This Is the 24 Solar Terms: Autumn**
First Edition 2018

© Dolphin Books Co., Ltd, Beijing, China, 2018
24 Baiwanzhuang Road, Xicheng District, Beijing 100037, China

海豚出版社 DOLPHIN BOOKS 中国国际出版集团

All rights reserved.

**ISBN 978-985-24-0245-3**

© Пераклад на беларускую мову. ТАА «Новое знание», 2021



## Квітнее хрызантэма

Хрызантэма — адна з нешматлікіх кветак, якія квітнеюць халоднай восенню. Кітайцы са старажытных часоў неабыякавыя да гэтай кветкі, таму існуе безліч вершаў, прысвечаных хрызантэме. І ў нашы дні назіранне за квіценнем хрызантэмы — адзін з папулярных спосабаў бавіць час увосень. Таксама існуе традыцыя піць кветкавае віно з хрызантэм у свята падвоенай дзявяткі. Шматлікія віды хрызантэм бываюць белымі, жоўтымі, фіялетавымі, розных памераў і з пялёсткамі розных форм. Гэту расліну вырошчваюць па ўсім Кітаі як дэкаратыўную кветку.

### Тры хоў халодных росаў

Падчас першага *хоў* дзікія гусі чарадой ляцяць на поўдзень.

Падчас другога *хоў* з поля зроку знікаюць маленькія птушкі, а на ўзбярэжжы з'яўляюцца малюскі. У іх перыяд размнажэння.

Падчас трэцяга *хоў* квітнее залатая хрызантэма.



## Дзікія гусі адлятаюць у вырай

Дзікія гусі ляцяць на поўдзень у час паміж белымі і халоднымі росамі. Тыя з іх, што сталі на крыло раней, у гэты час ужо даляцелі. Як кажуць, хто першы — той лепшы: да тых, хто прылятае пазней, першыя ставяцца, як да гасцей.

У чарадзе ёсць важак, астатнія птушкі ляцяць за ім шэрагамі ў выглядзе літары «Y», якая час ад часу змяняецца. Такі парадак важны, каб вытрымаць пералёт на далёкую адлегласць. Гусі, што ляцяць спераду, махаюць крыламі, накіроўваючы паветраную плынь і фарміруючы за сабой зону паветра з нізкім ціскам. Дзякуючы гэтаму, гусям за імі ляцець лягчэй, бо яны сустракаюць меншы супраціў паветра. Птушкі часта мяняюцца месцамі падчас пералёту і падаюць сігналы адзін аднаму, каб захаваць чараду.

## Аранне зямлі

Тэмпература паветра падае і ўжо амаль усе культуры сабраныя.

Прыказка кажа, што, пачынаючы з халодных росаў да пачатку зімы, земляробы аруць зямлю і ўсе шкоднікі ў ёй замярзаюць. Падчас арання фермеры разбураюць падземныя хованкі казурак, знішчаюць лічынак, альбо яны становяцца здабычай сваіх прыродных ворагаў. Таксама ў выніку гэтага дзеяння салома на паверхні змешваецца з глебай і зямля будзе больш урадлівай на наступны год.





## Свята падвоенай дзявяткі

У гэты дзень звычайна сонечна і светла — выдатнае надвор'е для паходу ў горы. Каб традыцыйна адзначыць свята падвоенай дзявяткі, трэба абавязкова пакаштаваць торт чуньян (яго гатуюць з рысавай мукі на пары і ўпрыгожваюць рознакаляровай кансерваванай садавінай) і віно з кветак хрызантэм. У гэты дзень, вядомы таксама як Дзень пажылых людзей, прынята праяўляць пашану да людзей сталага веку.



# ПАЧАТАК МАРАЗОЎ

Нарэшце прыйшоў час збіраць ураджай бульбы і морквы. Старэйшыя стрыечныя браты і сёстры мацнейшыя за Яю, таму яны збіраюць бульбу, а Яя выцягвае морквіны. Бабуля кажа, што поле трэба араць адразу пасля збору ўраджаю, пакуль зямля яшчэ мяккая.

# З'яўленне шэрані

Перыяд з'яўлення шэрані выпадае на 22, 23 ці 24 кастрычніка. Пачынаючы з гэтага часу, раса ператвараецца ў шэрань, з кожным днём робіцца ўсё больш холадна. Тэмпература на паверхні зямлі падае да 0 °С. Вільгаць у паветры дасягае сваёй найвышэйшай кропкі, вада выпараецца і асядае на паверхні тонкім слоем белых крышталікаў, якія мы называем шэранню. Пра шэрань, якая з'яўляецца ўвосень, кажуць «першая шэрань», а пра тую, што можна ўбачыць вясной, — «апошняя шэрань».




Калі ў дзень з'яўлення шэрані насамрэч з'явілася шэрань, наступны год будзе ўраджайны на збожжа.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °С



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °С

## Расліны вянуць

У гэтую пару года рэзка зніжаецца тэмпература, расліны і травы пачынаюць вянуць, а недастаткова трывалыя да маразоў культуры спыняюць свой рост і чакаюць збору. Розніца тэмператур паміж поўначчу і поўднем Кітая ўсё яшчэ вялікая. У большасці поўночных правінцый сярэднясутачная тэмпература паветра падае ніжэй за 0 °С у той час, як на поўдні шэрані яшчэ няма.





## Спее садавіна

Восенню саспявае садавіна ўсіх магчымых колераў: чырвоныя гранаты, фіялетавы вінаград, аранжавая хурма, залатыя грушы. І хаця большасць з гэтага можна набыць на працягу ўсяго года, найлепш выбіраць сезонную садавіну, бо яна найбольш свежая і танная.

### Тры хоў восеньскага раўнадзенства

Падчас першага хоў маланкі паступова знікаюць.

Падчас другога хоў насякомыя хаваюцца ў свае падземныя хованкі і закрываюць уваход глебай.

Падчас трэцяга хоў колькасць дажджоў памяншаецца.



## Зверы ўпадаюць у спячку

Тыя звяры, што ўпадаюць зімой у спячку, у гэты час пачынаюць рыхтавацца да яе і назапашваць тлушч у той час, як тыя, што не ўпадаюць, — нарыхтоўваюць запасы на зіму.



## Квітнее чырвоная лілея

Чырвоная павуцінка квітнее ў час восеньскага раўнадзенства. Суквецце складаецца з чатырох-сямі кветак з загнутымі назад пялёсткамі і доўгімі тычынкамі. Нягледзячы на прыгажосць кветкі, цыбулінкі гэтай расліны атрутныя і непрыдатныя для ежы.

## Свята сярэдзіны восені

Гэта свята адзначаюць 15-га чысла восьмага месяцовага перыяду: сям'я збіраецца разам і святкуе збор ураджаю. На стале мноства сезоннай садавіны, звычайна круглыя месяцовыя пернікі з разнастайнымі смакамі. Дарослыя распавядаюць дзецям легенды аб паходжанні гэтага свята і яго традыцыях.





## Восеньскі ураджай

Тэмпература паветра рэзка падае, а разам з ёй і тэмпература зямлі: яна ўжо недастаткова цёплая для росту раслін. Такім чынам, паспелі яны вырасці ці не, пасевы трэба прыбіраць. Земляробы збіраюць восеньскі ураджай рысу, сорга, кукурузы, сланечніку і бабовых. Акрамя гэтага, яны аруць зямлю і засяваюць насенне азімай пшаніцы, рапсу і іншых культур.



Кукуруза

Сланечнік

## Гульня пяці жывёл

Дзеці любяць гуляць у гульню пяці жывёл пры ясным месячным святле. Па правілах адзін з гульцоў паказвае рухі жывёлы, а астатнія павінны здагадацца, каго ён паказвае. Лічыцца, што гэтую гульню прыдумаў Хуа То (145–208 г. н. э) знакаміты медык позняй дынастыі Хань (25–220 г. н. э). Ці ведаеш ты, якія гэта пяць жывёл? Гэта тыгр, алень, малпа, мядзведзь і журавель.





# Халодныя росы

Рана з раніцы ў свята падвойнай дзявяткі (традыцыйнае свята, якое выпадае на дзявяты дзень дзявятага месяцовага перыяду), Яя з татам узабраліся на бліжэйшую гару. Стоячы наверсе, яны любаваліся панарамным відам на вёску. «Зірні, вунь дзядулева хата», — кажа Яя ў захапленні. «Нам трэба сабраць трохі кізілу, — кажа тата і дадае — гэта лекавая расліна ў традыцыйнай кітайскай медыцыне. А яшчэ лічыцца, што яна прыносіць бяспеку і ўдачу».

# Халодныя росы

Перыяд халодных росаў здараецца паміж 7 і 9 кастрчыніка. Раса з'яўляецца прыкметай таго, што ў Кітай прыйшла халодная пара. У параўнанні з белымі росамі тэмпература ў гэты перыяд значна ніжэйшая, а самі росы на зямлі ўжо заледзянелыя і ператвараюцца ў шэрань. Гэта час пераходу ад прахалоды да холаду, пасля якога тэмпература працягвае хутка падаць і ночы становяцца марознымі. Чыстае неба, залатое лісце... Прыйшла позняя восень.




Зямля вільготная ад халодных росаў.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* _______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* _______ °C

## Надыход восеньскіх халадоў



Падчас перыяду халодных росаў робіцца відавочнай змена сезонаў. У гэты час поўдзень Кітая вельмі адрозніваецца ад поўначы. На поўначы там-сям ужо можна ўбачыць снег, а на поўдні толькі пачынаецца восеньская прахалода. Дзікія гусі чарадой адлятаюць у выраій.



Салодкі асмантус

## Квітнее салодкі асмантус

Салодкі асмантус у гэты час квітнее на поўную моц і напаўняе наваколле сваім прыемным водарам. Маленькія кветкі гэтай расліны могуць быць розных колераў: ад светла-жоўтага, амаль белага, да ярка-жоўтага і аранжавага. Але радуюць яны не толькі вока, але і страўнік кітайцаў, бо з пялёсткаў асмантусу робяць гарбату, віно і слодычы.

### Тры хоў белых росаў

Падчас першага хоў дзікія гусі прылятаюць з поўначы.

Падчас другога хоў ластаўкі адлятаюць на поўдзень.

Падчас трэцяга хоў птушкі пачынаюць назапашваць ежу.



## Міграцыя на поўдзень

Адчувальныя да переменаў тэмпературы птушкі прымаюць меры, каб даць рады цяжкасцям гэтай пары года.



Дзікія гусі і ластаўкі становяцца на крыло і ляцяць чародамі на поўдзень, каб перачакаць там зіму. А такія птушкі, як сойкі і вераб'і, застаюцца зімаваць: у маразы іх грэе цёплае пер'е.





## Унабі саспелі

У гэты перыяд года ўнабі з зялёных становяцца чырвонымі і звісаюць з дрэў, што растуць уздоўж дарог. Ахвочыя да ласункаў дзеці ўзбіраюцца на дрэвы, каб сарваць плады, альбо спрабуюць збіць іх з зямлі доўгімі палкамі.

Пакаштуй унабі, падабраны з зямлі, памый яго і з’еш — і ты адчуеш асалоду ад гэтага смаку!

## Збор бавоўны

Усе каробачкі бавоўніка раскрыліся, і прыйшоў час іх збіраць. Земляробы носяць адмысловую торбу, прывязаўшы яе да таліі. Туды яны кладуць клапатліва сабраную бавоўну. Калі торба напаўняецца, яе заносяць да найбліжэйшай станцыі збору. Пасля прыбірання насення і некалькіх іншых працэдур, шарыкі бавоўны скручваюць у ніці, з якіх пазней састкуць тканіну.









# ВОСЕНЬСКАЕ РАЎНАДЗЕНСТВА



Часта фермеры настолькі занятыя ў сезон збору ўраджаю, што не прыходзяць дадому на абед, і таму дзеці прыносяць бацькам ежу ў гумно. Усе працы сканчваюцца з заходам сонца, і людзі вяртаюцца дахаты. Уся сям'я збіраецца за круглым сталом і адзначае свята сярэдзіны восені. «А на небе заўсёды поўня падчас свята сярэдзіны восені?» — запытвае Яя. Дзядуля тлумачыць, што кітайцы па традыцыі робяць ахвяраванні месяцу ў дзень Вясенняга раўнадзенства, але яно здараецца не ў адзін і той жа дзень, таму месяц можа быць не цалкам круглы. А свята сярэдзіны восені заўсёды адзначаюць 15-га чысла восьмага месяцовага перыяду, калі месяц дакладна поўны і ярка свеціць.



# Восеньскае раўна-дзенства

Восеньскае раўнадзенства адбываецца паміж 22 і 24 верасня. У гэты час Сонца свеціць наўпрост на экватар і, як вынік, дзень па працягласці становіцца роўным ночы. З надыходам гэтага сонечнага перыяду палова восені ўжо прайшла. З надыходам восеньскага раўнадзенства ноч у Паўночым паўшар'і становіцца даўжэй, а дзень на столькі ж скарачаецца. Зямля састывае ўсё больш і больш. Людзі робяць ахвяраванні Сонцу ў дзень Вясенняга раўнадзенства, Зямлі — у летняе сонцасатянне, Месяцу — у восеньскае раўнадзенства і небу — у дзень зімовага сонцастаяння.




З кожным восеньскім дажджом робіцца ўсё больш холадна.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C




## Астранамічныя назіранні

Пасля восеньскага раўнадзенства грымоты з маланкамі паступова згасаюць, а колькасць ападкаў памяншаецца. На працягу дня неба чыстае, а паветра свежае. Вечарамі ў небе мігцяць кропачкі зорак. З надыходам вясенняга раўнадзенства ручка каўша ў сузор'і Вялікай Мядзведзіцы паказвае акурат на захад.



## Арлы палююць

Выбітны зрок дазваляе арлу заўважыць здабычу з вышыні каля тысячы метраў над зямлёй! Ён кідаецца ўніз на палявую мыш ці дзікага труса, якія актыўна сябе паводзяць восенню, і моцна сціскае іх сваімі вострымі кіпцюрамі. Арлы таксама палююць на маленькіх птушак.

**Тры хоў спаду спёкі**

Падчас першага хоў арлы палююць на іншых птушак.

Падчас другога хоў усё вяне.

Падчас трэцяга хоў чакаецца шчодры ўраджай збожжа.

## Плады ўнабі чырванеюць

Напрыканцы жніўня плады ўнабі на дрэвах з зялёных становяцца чырвонымі. Унабі яшчэ называюць чырвоным фінікам, яны салодкія і дужа карысныя, бо змяшчаюць шмат вітамінаў. Прымаўка кажа: «Еш па тры ўнабі штодня і пражывеш да ста гадоў».





## Квітнее крэп мірт

Гэтая расліна квітнее, калі сыходзіць лета, надыходзіць восень і большасць кветак вяне. Сваёй другой назве «стодзённая чырвань» расліна абавязаная доўгаму перыяду цвіцення, хоць яе шматлікія кветкі могуць быць розных колераў: ружова-чырвоныя, малінавыя, насычана ружовыя, блёкла-чырвоныя, фіялетавыя і белыя. Маленькія кветачкі фарміруюць суквеццe.

Крэп мірт — высокае дрэва, яно можа пражыць каля 200 год. Калі дакрануцца да ствала, галінкі і лісце захістаюцца, нібы здрыгануўшыся ад козыту, за гэта крэп мірт атрымаў мянушку «казытлівае дрэва». Так адбываецца таму, што вяршаліна вельмі чуллівая і яе можна лёгка патрэсці.






Працэс вырабу ліхтара-лотаса

## Свята прывідаў

Чжун'юань Цзе адзначаюць 15-га чысла сёмага месяцовага перыяду. Як і вясенняе свята Чыстага святла, гэты дзень прысвечаны памяці продкаў. Людзі прыносяць да надмагілляў сваякоў свежыя ўнабі, вінаград і іншую садавіну. Увечары яны запальваюць ліхтары ў выглядзе кветак лотасу і пускаюць іх плыць па рацэ. Яны спадзяюцца, што разам з ліхтарамі сыйдзе смутак па памерлых.

## Спее збожжа

Колькасць гадзін сонечнага святла скарачаецца, тэмпература паветра падае — гэта запавольвае працэс біясінтэзу хларафілу. У раслін з'яўляюцца пігменты іншых колераў, ператвараючы першапачаткова зялёныя адценні ў жоўтыя і чырвоныя. Неўзабаве можна будзе збіраць рыс і сорга.



Рыс Сорга Проса Проса мяцёлчатае



# Белыя росы

Старэйшы брат Яі прачынаецца на досвітку, каб дапамагчы сабраць бавоўну. Бабуля кажа яму не выходзіць у поле, пакуль не высахне раса. «Але раса не высыхае, бабуля, пярэчыць Яя, — а выпараецца!» Бабуля ўсміхаецца. «Няхай так, абы ў бавоўне не хавалася».

## Белыя росы

Перыяд белых росаў выпадае на 7, 8 альбо 9 верасня. Тэмпература ў гэты час паступова зніжаецца, і выпарэнні з паветра часта кандэнсуюцца ўначы на траве і дрэвах ў выглядзе росаў. Аднак летняя спёка ўсё яшчэ працягваецца і гэта прыводзіць да найбольшых за ўвесь год перападаў тэмператур паміж днём і ноччу. Белыя росы — час, калі ўсё спее.




У белыя росы трэба цёпла апранацца, асабліва зранку і ўвечары.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

### Выпадае раса

Старая прыказка кажа: «Ад белых росаў да восеньскага раўнадзенства ночы становяцца халаднейшымі». Пасля перыяду белых росаў летні вецер саступае месца зімоваму, што дзьме з далёкай поўначы. Халодныя паветраныя масы пачынаюць дзьмуць на поўнач, паскараючы перапад тэмператур. Зранку, калі налятае восеньскі ветрык, раса ападае з кветак і лісця на зямлю, як крышталікі.





## Квітнеюць сланечнікі

У перыяд пачатку восені сланечнікі квітнеюць найбольш буйна. Круглае суквецце і залатыя пялёсткі цалкам тлумачаць назву гэтай расліны, якая звязана, акрамя таго, са здольнасцю кветкі паварочваць свой «твар» услед за сонцам на працягу ўсяго дня. У сланечніка прамое сцябло і шырокае лісце. Яго суквецце ўвесь час расце за кошт пастаяннага сілкавання, і ў выніку дае плады. Позняй восенню семечкі сланечніка саспеюць і іх можна будзе есці.

**Тры хоў пачатку восені**

Падчас першага *хоў* дзьмуць халодныя вятры.

Падчас другога *хоў* выпадаюць белыя росы.

Падчас трэцяга *хоў* цвыркаюць цыкады.



## Усё расце

Клубні батату набрынялі. Бавоўнік квітнее ў поўную моц. На кукурузе з'яўляюцца мяцёлкі, можна ўбачыць шаўковыя ніці катахаў — значыць, прыйшла найважнейшая пара цвіцення, апылення і фарміравання насення. Бабовыя культуры квітнеюць і выпускаюць струкі.




## Персікі саспелі

У гэтую пару года наліваюцца персікі, яны цяжка звісаюць з дрэў і гатовыя да збору. Можа ў цябе ўжо слінкі пацяклі, але не забудзь добра вымыць персік, валаскі на яго лупіне непрыемна пакалваюць рукі.

## Свята Цісі

Ці чуў ты легенду пра пастуха і ткачыху? Паводле яе паміж закаханымі пралягае Млечны шлях і яны могуць сустрэцца толькі адзін раз у год — у сёмы дзень сёмага месяцовага перыяду. Вечарам гэтага дня дзяўчаты ўглядаюцца ў неба ў пошуках зорак Альтаір і Вега, спадзеючыся стаць сведкамі іх штогадовай сустрэчы. Шмат хто моліцца Ткачыхе аб шчаслівым шлюбе, ухваляючы яе кемлівасць.




## Узважванне

У дзень пачатку восені людзі па традыцыі ўзважваюцца, каб параўнаць сваю цяперашнюю вагу з той, што была ў дзень пачатку вясны. Летняя спёка часта прымушае людзей губляць апетыт і, як вынік, вагу. З надыходам восені і прахалоды ў людзей з'яўляецца магчымасць есці больш і вярнуць вагу, якую яны згубілі за лета. Адбываецца гэта дзякуючы даданню ў рацыён розных відаў мяса і называецца «назапашванне восеньскага тлушчу».



## Восеньскія спевы цыкад

З надыходам восені цыкады цвыркаюць яшчэ больш гучна, чым раней, гэта гучыць амаль як гул. Іх жыццёвы цыкл, што складаецца з трох перыдаў: яйка, лічынка і дарослая асобіна — зараз завяршаецца. Нягледзячы на тое, што ён не такі ўжо і кароткі, большую частку жыцця цыкады праводзяць у цёмных расколінах пад зямлёй.



1. Самка цыкады адкладае яйкі на кары дрэва, выбіраючы невялікую галінку, якая пазней вяне ад недахопу вады і сілкавання, і падае на зямлю.



2. Лічынка вылупляецца з яйка і жыве ў каранях дрэва, яна харчуецца сокам каранёў. Лічынка доўга застаецца пад зямлёй: ад двух да дзесяці год — і за гэты час праходзіць 4–5 лінек.



3. Незадоўга да апошняй лінькі вечарам, у прыцемках, цыкада выходзіць з-пад зямлі і залазіць на дрэва. Яна чапляецца за кару і рыхтуецца да ператварэння.



4. Знешняя абалонка пачынае злазіць з сярэдзіны спіны, такім чынам дазваляючы найперш з'явіцца галаве насякомага, а затым — тулаву і празрыстым крылам. Праз некаторы час тулава робіцца цямнейшым, а крылы становяцца дастаткова цвёрдымі для таго, каб цыкада магла ўздымацца ў паветра і лётаць.

# Спад спёкі



Праз вёску цячэ шырокая рака. Дзецям забаронена блізка да яе падыходзіць ва ўсе астатнія дні, акрамя Чжун'юань Цзе, альбо свята прывідаў. У гэты перыяд ушаноўваюць памяць памерлых сваякоў і сяброў. Але Яі не страшна. Яна вучыцца рабіць прыгожыя ліхтары ў выглядзе лотасаў. Разам з іншымі дзецьмі Яя запальвае ліхтары, апускае на ваду і назірае, як яны адплываюць. Старэйшыя дзеці плывуць у лодках і накіроўваюць ліхтары да сярэдзіны ракі. Здалёк мігценне свечак выглядае як Млечны шлях на зямлі.

## Спад спёкі

Спад спёкі звычайна прыходзіць паміж 22 і 24 жніўня. Назва гэтага сонечнага перыяду адлюстроўвае перамены ў тэмпературы паветра. Адгэтуль з кожным днём яно становіцца ўсё халаднейшым. На большай частцы тэрыторыі Кітая сезон дажджоў завяршаецца. У гэты перыяд прынята ўшаноўваць памяць продкаў і вітаць сезон збору ўраджаю.




Пасля спаду спёкі робіцца ўсё больш холадна, паветра бывае гарачым толькі апоўдні.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

### Штучныя дажджы

На поўначы Кітая з-за вялікай розніцы паміж тэмпературай паветра днём і ноччу людзям трэба апранаць нешта цёплае, калі яны выходзяць з дому раніцай ці вечарам. На поўдні краіны іншая сітуацыя: на большасці тэрыторыі ўсё яшчэ «тыгр восені». Дажджы тут ідуць рэдка, і мясцовыя метэаралагічныя агенцтвы запускаюць у неба самалёты з пірапатронамі, якія выклікаюць дождж. Такім чынам можна панізіць тэмпературу паветра, пазбегнуць засухі і забяспечыць вадой шматлікія фермы.





З надыходам восені ў Яі з’яўляецца шмат спраў. Першае асабістае заданне, якое яна атрымала, — правяраць штораніцы, як маюцца расліны. Яя стаіць ля падпоркі для вінаграду і глядзіць на зялёныя гронкі, правяраючы, ці спеюць яны. Затым ідзе праверыць персікі, што вісяць на персікавых дрэвах, ці наліваюцца яны. І ўрэшце, як там сланечнік і яго семечкі.

Рост раслін увосень

| Дата / Расліны | Персік | Вінаград | Гранат | Унабі | Сланечнік |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 жніўня | Краі пачырванелі | Трохі кіслы | Маленькі | Зялёны | Квітнее |
| | | | | | |
| | | | | | |

Дзядуля ўсміхаецца і кажа: «Яя становіцца цікаўнай назіральніцай! Давай зробім табліцу, дзе будзем пазначаць, як хутка спеюць плады, і занатоўваць змены, якія ты заўважаеш».

З дапамогай дзядулі Яя стварыла схему, якая паказвае этапы росту гэтых восеньскіх раслін.

## ГЕРБАРЫЙ



Клён



Шаўкоўніца



Вярба

На зямлю ападае лістота. Яя падымае самыя прыгожыя лісцікі і кладзе іх паміж старонкамі кніг. Праз некалькі дзён лісце, сціснутае старонкамі, падсохне — у такім выглядзе яго можна захоўваць пэўны час.



Кітайская белая таполя



Гінко



Паўлоўнія, альбо адамава дрэва



















Кожнае дрэва мае сваё асаблівае лісце. Яя зрабіла прыгожыя калажы с засушанага лісця.



# ПАЧАТАК ВОСЕНІ

Восень распачынаецца святам Цісі. У гэты дзень дзяўчаты ставяць на стол на двары садавіну, запальваюць духмяныя свечкі і моляцца Дзяўчыне-ткачыхе — феі з народнай легенды, якая працавала ткачыхай у Маці-багіні Нябёсаў, у яе просяць аб мудрасці і спрыце ў працы.

Зранку Яя з бабуляй ідуць збіраць свежыя персікі. Бабуля зрывае вялікі сланечнік спецыяльна для Яі, каб дзяўчынка ўпрыгожыла ім стол.

# Пачатак восені

Пачатак восені выпадае на 7, 8 ці 9 жніўня. Гэта першы сонечны перыяд сезона, але спёка яшчэ трымаецца, таму больш слушна будзе назваць яго пераходам ад лета да восені. Да надыходу восеньскай прахалоды яшчэ пройдзе пару цёплых дзён. Па метэаралагічных стандартах пасля таго, як сярэднесутачная тэмпература ў адным канкрэтным месцы трымаецца на працягу пяці дзён паміж 10 °C і 22 °C, лічыцца, што прыйшла восень.




Калі зранку настаў пачатак восені, увечары будзе прахалодна.






*Занатуй паказчыкі тэрмометра ў гэты дзень.*



*Найвышэйшая тэмпература* ______ °C



*Найніжэйшая тэмпература* ______ °C

## Тыгр восені

У пачатку восені раніцай і вечарам ужо халаднавата, але днём яшчэ спякотна. Апошні перыяд дзённай спёкі надыходзіць пасля пачатку восені. Кітайскія земляробы кажуць: «Пачатак восені надышоў, а карове да смерці спякотна». Людзі называюць не па сезону цёплае надвор'е гэтага перыяду «тыграм восені». У гэтую пару на большай частцы тэрыторыі Кітая даволі спякотна і ўсе культуры інтэнсіўна растуць.





## Квітнее гібіскус пераменлівы

Звычайна ў перыяд з'яўлення шэрані квітнее гібіскус пераменлівы. Ён бывае розных яркіх колераў, такіх як чырвоны, белы, жоўты, чырвона-белы, а таксама пераменлівага колеру: белым з раніцы, ружовым апоўдні і чырвоным увечары.

### Тры хоў з'яўлення шэрані

Падчас першага *хоў* ваўкі палююць і захоўваюць здабычу на зіму.

Падчас другога *хоў* расліны пачынаюць вянуць і становяцца жоўтымі.

Падчас трэцяга *хоў* насякомыя ўпадаюць у спячку.



## Лісце жаўцее і чырванее

З'яўленне шэрані — найлепшы перыяд, каб любавацца лісцем клёнаў. Недастаткова трывалыя расліны перастаюць расці. Халоднае надвор'е і кароткі светлавы дзень запавольваюць выпрацоўку хларафілу. Таму лісце ўвосень становіцца жоўтым і чырвоным.



## Лісце лотасу вяне

Над паверхняй сажалак можна ўбачыць пакінклае лісце лотасу. А пад вадой — яго карані чакаюць, калі іх выкапаюць.

## Ураджай сабраны

Перад пачаткам зімы фермеры занятыя зборам бульбы, капусты, радыскі, а таксама араннем зямлі.



Збор бульбы



Зразанне сцёблаў бавоўніку

## Хурма наліваецца

З надыходам з'яўлення шэрані на сталах з'яўляецца хурма: у гэты час яна ўжо цалкам саспявае. Хурма з шэранню на паверхні — найбольш салодкая. А яшчэ лічыцца, што, калі еш такую хурму, зімой не прастудзішся. Гэты плод можна есці не толькі свежым, але таксама кансерваваным.



Як зрабіць піроæныя з хурмы

1. Памый і высушы хурму, а затым здымі з яе лупіну.
2. Пакладзі пачышчаную хурму на бамбукавыя паддоны, пакінь іх у сонечным месцы з добрай вентыляцыяй да таго часу, пакуль паверхня хурмы не стане сухой. Далікатна прыцісні хурму, зрабіўшы з яе круглыя піроæныя.
3. Пакладзі піроæныя зноў на паддон і пакінь на сонцы на 8–10 дзён, потым зноў далікатна прыцісні хурму.
4. Пакладзі піроæныя з хурмы ў кантэйнер і накрый іх поліэтыленавай плёнкай. Пакладзі зверху вечка і дачакайся, пакуль на піроæных з'явіцца слой шэрані.



*Пачатак восені*

*Спад спёкі*

*Белыя росы*

*Восеньскае раўнадзенства*

*Халодныя росы*

*З'яўленне шэрані*



## Гульня «Злучы адпаведнасці»

Правілы гульні: два гульцы спрабуюць злучыць у пары малюнкі з назвамі адпаведных ім сонечных перыядаў. Перамагае той, хто першым правільна злучыць іх.














Існуе чатыры пары года. Старажытныя кітайцы падзялілі іх на 24 сонечныя перыяды, кожны з якіх адлюстроўвае адметную фазу сезонных зменаў. Сонечныя перыяды не толькі падказваюць, што трэба рабіць земляробам, але і дапамагаюць кожнаму з нас прадбачыць змены надвор'я.

Гэта кніга апавядае гісторыю дзяўчынкі Яі, якая наведвае сваіх бабулю і дзядулю ў вёсцы і назірае, як 24 сонечныя перыяды паступова змяняюць адзін аднаго на працягу года. Разам з Яяй вы трапіце на традыцыйныя кітайскія святы, даведаецеся пра старажытныя абрады, навучыцеся лепш разумець мову прыроды, назіраючы за жывёламі, раслінамі і з'явамі надвор'я.



www.wnk.biz
sale@wnk.biz
ISBN 978-985-24-0245-3